лічыць асобу, продак якой па мячы ў папярэднім пакаленні трымае адзін з найвышэйшых урадаў, а магнацкі род павінен на працягу трох каленаў мець сваіх прадстаўнікоў сярод паноў-рады ці трох найвышэйшыхураднікаў сярод прадстаўнікоў аднаго пакалення. Адным з асноўных фактараў у працэсе пераўтварэння ў магната са служылай шляхты было валоданне буйной уласнасцю і пашырэнне зямельных уладанняў з дапамогай выгадных шлюбаў, вялікакняжацкіх наданняў, атрымання іх у спадчыну [3, с. 27]. Як бачна з вышэй прыведзенага, базавыя крытэрыі далучэння да магнацкага саслоўя куды больш складаныя, чым проста ўваходжанне ў кола шляхты. Акрамя вялікіх латыфундый і маёнткаў, дзяржаўных пасадаў, сярод прыкмет прыналежнасці да магнацкага саслоўя, па меркаванню даследчыцы Альбіны Семянчук, можна вылучыць блізкасці да каралеўскага двара, сямейныя сувязі, мецэнацкую дзейнасць і значэнне роду, а таксама асабістыя якасці, а перад усім – адукацыю [4, с. 141]. Гэта яшчэ ў большай ступені абмяжоўвае доступ да элітарных колаў і супольнасці магнатэрыі.

На наш погляд, самым складаным крытэрыем, які ў значнай ступені абмяжоўваў кола абраных і ўзвышаў яго носьбітаў, з'яўлялася наяўнасць тытула. Справа ў тым, што фармальна ў ВКЛ уся шляхта была роўнай і наяўнасць тытула не надавала канкрэтных, замацаваных у Статуце прывілеяў. У сувязі з гэтым у Княстве не была распрацаваная і распаўсюджаная сістэма тытулаў накшталт заходнееўрапейскай. Тытулы ў ВКЛ з'яўляюцца ў XVI ст., і былі яны паходжаннем са Святой Рымскай імперыі: у той час ВКЛ мела актыўныя дыпламатычныя стасункі з імперыяй. Атрымлівалі тытулы паслы вялікага князя, якія ажыццяўлялі пасяховую дыпламатычную місію (гэты факт ужо абмяжоўваў кола патэнцыйных носьбітаў тытулу, бо у пасольства, як правіла, выпраўляліся толькі саноўнікі высокага рангу). Такім чынам у сярэдзіне XVI ст. з тытулаваных родаў – Гаштольдаў (атрымалі тытул адны з першых, але выгаслі ў сярэдзіне стагоддзя), Радзівілаў, Хадкевічаў, Іллінічаў, Агінскіх, што мелі тытул графа альбо князя Святой Рымскай імперыі – сфармавалася вузкая пануючая супольнасць, якую можна акрэсліць як эліта грамадства.

**Заключэнне.** Наяўнасць тытула (княжацкага, графскага), атрыманага ад імператара Святой Рымскай імперыі, адыгрывала важную ролю ў працэсе фармавання пануючай эліты ВКЛ. Тытул – складаны і амаль недасяжны крытэрый, выканаўшы які, магнат трапляў у вельмі вузкае кола асоб, што рабіла яго адметным ад іншых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, а таксама надавала вонкавага лоску магнацкаму тытулаванаму двару.


Літаратура

1. Пятраўскас, Р. Літоўская знаць кан. XIV–XV ст.: Склад – структура – улада / Рымвідас Пятраўскас; пераклад з літоўскай мовы Алесь Мікус. – Смаленск: Інбелкульт, 2014. – 386 с.

2. Лойка, П.А. Афармленне шляхецкага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім / А.П. Лойка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2010. – С. 102–115.

3. Скеп'ян, Н. Да пытання фармавання магнацкага саслоўя ў ВКЛ у XV – першай палове XVI ст. / Н. Скеп'ян // ARCHE Пачатак № 6. – 2014. – С. 26–41.

4. Семянчук, А. Магнацкія двары як цэнтры гістарыяграфіі ў Вялікім Княстве Літоскі ў XVI ст. / А. Семянчук // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зб. навук. прац / рэдкал.: (гал. рэд.) А.М. Янушкевіч [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 139–157.


## РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАГА МІНУЛАГА Ў ЭКСПАЗІЦЫЯХ РЭГІЯНАЛЬНЫХ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ МУЗЕЯЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ)


***Гаўрылава С.В.***

*саіскальнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Джумантаева Т.А., канд. культуралогіі*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змена метадалагічнага падыходу ў даследаванні працэсу гістарычнага развіцця беларускай нацыі ў канцы XX ст. значна паўплывала на музей як інстытут, які фарміруе сацыяльна-гістарычную памяць народа. У першую чаргу пераўтварэнні закранулі музеі гістарычнага і краязнаўчага профілю, якія, ажыццяўляючы селекцыю гістарычнага матэрыялу, ствараюць інтэрпрэтацыйную мадэль гісторыі Беларусі. Актуальнай праблемай краязнаўчых музеяў Беларусі з'яўляецца трансфармацыя існуючых экспазіцый у адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі ў нацыянальнай гістарыяграфіі і музеялогіі. Адным з этапаў вырашэння ўказанай праблемы з'яўляецца аналіз патэнцыялу сучасных краязнаўчых музеяў Беларусі ў рэпрэзентацыі нацыянальнага і рэгіянальнага гістарычнага мінулага і здабыткаў экспазіцыйнага будаўніцтва 1990–2000-х гг., што і было абрана ў якасці мэты сапраўднага даследавання.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі электронныя публікацыі краязнаўчых музеяў, размешчаныя на афіцыйных старонках устаноў на партале «Museum.by», якія ўтрымлівалі звесткі пра змест гістарычных экспазіцый музеяў, а таксама адпаведныя артыкулы ў даведачным выданні «Музеі Беларусі». Інфармацыя, атрыманая ў тым ліку і шляхам непасрэднага назірання экспазіцый асобных краязнаўчых музеяў, была падвергнута аналізу на прадмет агульнага і прыватнага ў адборы і рэпрэзентацыі гістарычных фактаў, з'яў і працэсаў, па выніках якога былі выдзелены характэрныя для ўсіх музеяў абранага профілю тэматычныя экспазіцыйныя блокі і новыя для айчынных музеяў напрамкі ў рэпрэзентацыі рэгіянальнай гісторыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Рэпрэзентуючы мінулае ў экспазіцыях краязнаўчых музеяў Віцебскай вобласці, яго ўмоўна падзяляюць на 2 блокі: гістарычнае мінулае горада/раёна і гісторыя XX ст. Такі падзел, на наш погляд, мае пад сабой падмурак, закладзены савецкай музеялогіяй, калі краязнаўчыя музеі разглядаліся ў якасці месца сканцэнтравання асноўных звестак аб прыродзе, гістарычным мінулым і сацыялістычнай перабудове краю, тым самым падзяляючы ўвесь працэс гістарычнага развіцця на да- і паслярэвалюцыйны час са значнай перавагай апошняга. Так, напрыклад, экспазіцыя Бешанковіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея мае 7 раздзелаў, 1 з якіх – «Гістарычнае мінулае раёна» – ахоплівае прамежак часу ад старажытнасці да 1917 г., а астатнія раздзелы прысвечаны падзеям XX ст. [1, с. 107].

Багатыя калекцыі археалогіі дазваляюць сучасным музейным супрацоўнікам раскрыць тэму гістарычнага мінулага горада/раёна ад старажытных часоў, якую храналагічна пачынаюць з эпохі каменнага века.

У рэпрэзентацыі гісторыі ў экспазіцыях рэгіянальных краязнаўчых музеяў прасочваюцца агульныя тэндэнцыі, што праяўляецца ў адборы знакавых гістарычных падзей з агульнабеларускай гісторыі, і прыватныя, абумоўленыя лакальным гістарычным кантэкстам. Найбольш яскрава гэта праяўляецца ў рэпрэзентацыі гісторыі XX ст. Як прыклад, амаль для ўсіх музеяў характэрны паказ рэвалюцыйных падзей 1917 г., этапаў станаўлення савецкай улады, падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Лакальныя асаблівасці выявіліся ў паказе падзей Першай сусветнай вайны (Талачынскі, Пастаўскі, Полацкі), жыцця мясцовага грамадства на тэрыторыі Заходняй Беларусі (Браслаўскі, Пастаўскі). Найбольшая ўвага музейшчыкаў нададзена тэме Вялікай Айчыннай вайны: у экспазіцыях многіх краязнаўчых музеяў гэта тэма прадстаўлена асобнымі раздзеламі ці адпаведнымі выстаўкамі.

Найменш асвечаным на сённяшні дзень застаецца перыяд пасляваеннага будаўніцтва і савецкі час, зусім не рэпрэзентаваны ў экспазіцыях краязнаўчых музеяў перыяд незалежнай Беларусі. Прадпрыняты толькі адзінкавыя спробы запоўніць гэтыя лакуны. Выстаўка «Віцебскі раён. Быт і культура XX ст.» Віцебскага [2] ці «Рэтрапакой» Бешанковіцкага [3] раённых гісторыка-краязнаўчых музеяў з'яўляюцца даволі спрэчным спосабам рэпрэзентацыі сучаснай гісторыі. Некаторыя музеёлагі слушна заўважаюць, што этнаграфія не дае ўяўлення пра жыццё сучаснага грамадства; лёс рэгіёну, людзей, рэальнае жыццё застаюцца па-за дужкамі [4, с. 39].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важным недахопам фармацыйнага падыходу, які з'яўляўся асноўным у пабудове экспазіцый краязнаўчых музеяў, гісторыкі называюць нязначную ўвагу да ролі асобы ў гісторыі, аднак справядліва будзе заўважыць, што ў музейнай практыцы маюцца выпадкі звароту да гэтай тэматыкі супрацоўнікаў некаторых музеяў: Браслаўскага (экспазіцыйныя комплексы, прысвечаныя краязнаўцам і ўраджэнцам Браслаўшчыны), Гарадоцкага (зменная выстаўка «Нашы знакамітыя землякі»), Талачынскага («Талачыншчына і талачынцы») музеяў [1, с. 113, 188, 525] і інш.

Дэідэалагізацыя музейнай інтэрпрэтацыі гісторыі канца XX – пачатку XXI стст. зрабіла магчымым асвятленне ў экспазіцыі «забароненых» раней тэм, такіх як, напрыклад, палітычныя рэпрэсіі 1930-х гг. Адпаведны тэматычны блок выдзелены ў структуры экспазіцыі Краязнаўчага музея Полацка, Пастаўскага раённага краязнаўчага музея.

**Заключэнне.** Такім чынам, краязнаўчыя музеі Віцебскай вобласці валодаюць вялікім патэнцыялам у рэпрэзентацыі гістарычнага мінулага свайго рэгіёну і фарміраванні рэгіянальнай і нацыянальнай ідэнтычнасці мясцовага насельніцтва. Яны па-ранейшаму маюць класічную экспазіцыйную структуру, але назапашаныя музейныя калекцыі даюць магчымасць адлюстраваць гісторыю рэгіёнаў ад старажытных часоў да сучаснасці, узнаўляючы рэгіянальны культурна-гістарычны кантэкст. Навукова-даследчая праца, якая вядзецца навуковымі супрацоўнікамі, дазваляе дапаўняць сталыя экспазіцыі матэрыяламі па новых тэмах. Адным са спосабаў запаўнення гістарычных лакун у музейных экспазіцыях з'яўляецца стварэнне выставак адпаведнай тэматыкі. Шматвектарнасць выбару сучаснай метадалогіі пазнання гісторыі вельмі марудна, але ўплывае на работу музейшчыкаў, у прыватнасці, павысілася цікавасць да вывучэння ролі асобы ў працэсе гістарычнага развіцця рэгіёну. Спраектаваныя яшчэ ў савецкія часы экспазіцыі краязнаўчых музеяў застаюцца па сённяшні дзень спадчынай савецкай эпохі, калі рэпрэзентацыя станаўлення савецкай улады і падзей Вялікай Айчыннай вайны непараўнальна пераважала над паказам гістарычнага мінулага. Аналіз тэматычнай структуры музеяў паказаў, што актуальнай праблемай сучасных краязнаўчых музеяў з'яўляецца не толькі трансфармацыя існуючых экспазіцый згодна запытам нацыянальнай гістарыяграфіі і музеялогіі, а і ўключэнне ў іх тэматычных раздзелаў, прысвечаных гісторыі 2-й паловы XX – пачатку XXI стст. А для гэтага неабходны моцны тэарэтычны падмурак, які заключаецца ў вызначэнні асаблівасцяў музейнай інтэрпрэтацыі гісторыі і стварэння яе інтэрпрэтацыйнай мадэлі ў экспазіцыях краязнаўчых музеяў рэспублікі.

Літаратура

1. Музеі Беларусі = Музеи Беларуси / рэд. савет: Г.П. Пашкоў, Л.В. Календа, М.Г. Нікіцін. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2008. – 560 с. : іл.
2. Учреждение культуры «Витебский районный историко-краеведческий музей». Официальный сайт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://vrgkm.museum.by/. – Дата доступа: 10.09.2015.
3. Ретро-комната // Учреждение культуры «Бешенковичский районный историко-краеведческий музей» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://beshenkovichi.museum.by/node/35034. – Дата доступа: 25.02.2016.
4. Ольшевская, Г.К. Задачи трансформации экспозиций по новейшей истории в региональных музеях / Г.К. Ольшевская // Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период / отв. ред. И.В. Чувилова. – СПб.: Алетейя, 2009. – С. 37–40.

## РЕЛИГИОЗНАЯ ПОЛИТИКА В ТУРЦИИ С 2000-х гг.

***Голубев В.А.***
*магистрант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Величко Н.В., канд. ист. наук, доцент*

Несмотря на то, что Турция объявляет себя светским государством, тем не менее, активное сотрудничество преимущественно с исламскими государствами, возрастающая ак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ